


Рисунок 1 - Модельное представление формулы подготовки высококлассного специалиста, новатора или молодого ученого

Позиционирование, в модели РРР, практических примеров успеха, успешных людей, однозначно подтолкнет общество к целеустремленному поступлению в ВУЗ, т.е. выбора профессии и стратегии жизненного развития. Именно такая формула нами будет выноситься в разработку как рабочее предложение для обсуждения на заседании Координационного совета по делам молодежи в научной и образовательной сферах при Совете при Президенте Российской Федерации по науке, технологиям и образованию.

ЛИТЕРАТУРА

1. Глинушкин, А.П. Студенческое научное общество «Агроэкотест» как инновационный кадровый потенциал ВУЗА / А.П. Глинушкин //Сборник материалов конференции Инновационные технологии в образовании и научно-исследовательской работе. - Ор–нбург: Издательский центр ОГАУ, 2008. – С. 83-88.

УДК 378.147.091: [32+94](476.6)

## ІНТЭРДЫСЦЫПЛІНАРНАСЦЬ У ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ: АЙЧЫННАЯ ГІСТОРЫЯ І ПАЛІТАЛОГІЯ

**Галубовіч В.У.**
УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт”
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Сярод базавых гуманітарных навук, якія пакуль яшчэ выкладаюцца ў беларускіх вышэйшых навучальных установах, пачэснае месца займаюць айчынная гісторыя і паліталогія. Дысцыпліны гэтыя ў прынцыпе пакліканыя сфармаваць у студэнта тое галоўнае, што павінна аб’ядноўваць сапраўдных грамадзянаў – пачуццё павагі да свайго мінулага і грамадзянскай адказнасці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

за сучаснасць ды будучыню. І гісторыя, і паліталогія ідуць да вырашэння гэтай супольнай мэты крыху адрознымі шляхамі: у першай пераважае экстэнсіўна-ілюстратыўная мадэль, у другой галоўную скрыпку грае аналітыка і схематызацыя. У абодвух выпадках сваю ролю адыгрывае і эмацыянальны кампанент. Фактычна атрымліваецца, што гісторыя з'яўляецца абавязковым фонам для паліталогіі і наадварот, паколькі паліталагічны аналіз абавязкова вянчае разважанні адносна вынікаў гістарычнага развіцця. Канешне, далёка не ўсе гістарычныя працэсы, калі прытрымлівацца навуковых прынцыпаў, можна падпарадкаваць паліталагічным схемам (*напрыклад, што рабіць з эвалюцыяй старажытных прылад працы*), але амаль усё, што датычыцца так званай пісанай гісторыі (*унутраная і знешняя палітыка*), можна лічыць бяздоннай крыніцай звестак для палітычнай навукі. Дзеля праўды, варта прызнаць, што пры вялікім імпэце палітызаваць гісторыю ўсё ж магчыма, але ў такім выпадку празмернае ўмяшальніцтва будзе азначаць свядомую яе фальсіфікацыю.

У навучальным працэсе гісторыя і паліталогія непарыўна звязаныя між сабой: адэкватнае ўспрыманне першай з'яўляецца асновай для засваення другой. Больш таго, няздольнасць да аналіза фактаў, слабая гістарычная эрудыцыя, а часам тое і другое разам, аўтаматычна пазбаўляюць студэнта магчымасці разважаць на паліталагічныя тэмы, сыходзячы з рацыяналістычнай парадыгмы. Засвоеныя ў курсе айчыннай гісторыі міфы, аднабаковыя трактоўкі падзей ці фактаў, ідэалагічныя штампы альбо нават іх урыўкі пазней становяцца непераадольным мурам стэрэатыпаў, на аснове якога амаль немагчыма засваенне палітычных тэорый і дэфініцый. Аксіёмай у паліталогіі з'яўляецца тое, што якія б ні былі веды ды ідэалы, праўдзівыя альбо не, яны вызначаюць практыку. Тут працуе таксама вядомы закон: без ведання і павагі да ўсяго мінулага нельга зразумець накірункі развіцця сучаснасці і пабудаваць будучыню, якая была б прымальнай для ўсіх. Варта таксама закрануць яшчэ адну праблему. Кожная айчынная гісторыя (польская ці беларуская, украінская ці шведская) праўдамі ці няпраўдамі імкнецца падкрэсліць унікальнасць свайго мінулага. Аднак жа палітычная навука, у адрозненні ад гісторыі, арыентаваная не толькі на выяўленне адметнасцяў, але і агульнага. Нездарма з часоў Платона і Арыстоцеля палітычная навука так шмат увагі надае параўнаўчаму метаду, тыпалагізацыі з'яў і працэсаў. Сучасная ж глабальная паліталогія пабудаваная на ўсё тых жа агульнавядомых прыкладах, на узорах *сусветнай* значнасці. У выніку атрымліваецца, што мы фарміруем новыя веды на новых, але чужых прыкладах. Фактычна ж беларуская паліталогія ігнаруе досвед айчыннай гістарыяграфіі і гэтым самым пазбаўляе наша студэнцтва ўсведамлення практычнай каштоўнасці вывучэння гісторыі. Палітычная навука павінна адмовіцца ад вельмі лёгкага хлеба і прыкласці максімум намаганняў для актуалізацыі палітыкі мінулага як зыходнага моманта для развагаў пра сучаснасць. Дзеля гэтага беларуская паліталогія можа максімальна скарыстаць дасягненні айчыннай гістарыяграфіі.

Магчымыя накірункі перасячэння дзвюх дысцыплін нескладана пералічыць. Для прыкладу спынімся толькі на адной тэме: ***дзяржава як палітычны інстытут***, якая з'яўляецца абавязковай у курсе паліталогіі ў вышэйшых навучальных установах.

Кожны фрагмент дадзенай тэмы лёгка спалучаецца з ведамі, якія студэнт ужо атрымаў у курсе айчыннай гісторыі. Спынімся літаральна на некалькіх



РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ

пунктах і абмяжуемся інфармацыйнымі магчымасцямі беларускай гісторыі IX-XVIII стст.:

- ***Праблема паходжання дзяржавы.***

Гісторыя дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі мае вялікія традыцыі. Нашы землі сталі асновай для ўзнікнення такіх усходнеславянскіх дзяржаваў, як *Полацкае і Турава-Пінскае княствы*. Полацкае княства можа з'яўляецца класічным узорам ***захопніцкай версіі дзяржаваўтварэння***, калі прыняць версію, што першы вядомы мясцовы князь Рагвалод быў варагам. Турава-Пінская дзяржава ўзнікае ў выніку сепарацыі даменіяльных земляў Кіеўскага княства і паказвае магчымыя варыянты ўтварэння дзяржаў у выніку распаду штучных утварэнняў, аб'яднаных пераважна захопніцкім шляхам. Сучасная сусветная гісторыя па ілюстратыўнасці нават саступае гэтым айчынным прыкладам, паколькі патрабуе шырокіх экскурсаў у мінулае.

Беларускія землі ўваходзілі ў масіў тэрыторый, на аснове якіх было утворана *Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае*. У складзе гэтай дзяржавы беларускія землі знаходзіліся ***найбольш доўга***: з XIII ст. па XVIII ст. Абыйсці гэты пяцісотгадовы перыяд надзвычай складана, паколькі менавіта ў межах ВКЛ паўстаў асобны беларускі народ. Працэс узнікнення ВКЛ з'яўляецца цудоўным прыкладам шляхоў фармавання дзяржаваў у прынцыпе, паколькі яно ўзнікала пад уздзеяннем знешняга ціску з боку крыжакоў, Галіцка-Валынскага княства, а шляхі далучэння земляў да новай дзяржавы ілюструюць амаль усе магчымыя мадэлі павялічвання дзяржавы: праз захоп новых тэрыторый, заключэнне дамоваў і шлюбных пагадненняў. Увогуле ўнікальны матэрыял для дэманстрацыі ***дамоўнага шляху утварэння дзяржаваў*** даюць так званыя *абласныя прывілеі*, якія атрымлівалі Полацкая і Віцебская землі ад вялікіх князёў літоўскіх у XV-XVI стст.

- ***Формы дзяржаўнага праўлення і ўладкавання.***

Сучасныя дзяржавы несумненна адрозніваюцца ад старажытных, але палітолагі забываюцца нагадваць, што перашапачатковай формай праўлення на тэрыторыі Беларусі была менавіта манархія. Канешне ж, з усімі атрыбутамі раннефеадальнага адзінаўладдзя. Хто будзе спрачацца, што лёсы Полацкага княства напрамую залежалі ад лёсаў адной асобы ў часы праўлення Усяслава Чарадзея? Без запатрабавання застаецца і вядомае з летапісаў сведчанне ***пра рэспубліканскі характар*** Полацкага дзяржаўнага ладу.

Найбольш жа яскравых прыкладаў па вылучанай праблеме дае час ўваходжання ВКЛ у склад Рэчы Паспалітай. Прынцыповы характар мае актуалізацыя тэрмінаў ***шляхецкая рэспубліка*** і ***элекцыйная манархія***, якія выкарыстоўваюцца ў адносінах да Рэчы Паспалітай. Апошняя ўзнікае як федэратыўнае ўтварэнне, дзе адзінымі супольнымі элементамі былі манарх і парламент. Чым не праклад ***федэратыўных адносінаў*** краін, якія захоўвалі асобныя фінансавыя, прававыя, вайсковыя, бюракратычныя сістэмы, а часам нават праводзілі ўласную знешнюю палітыку.

- ***Інстытуты дзяржаўнай улады.***

Станаўленне асобных галінаў дзяржаўнай улады звычайна праводзіцца на заходнееўранейскіх узорах. Сапраўды, карысна ведаць, што першы парламент узнік у Англіі ў XIII ст. Аднак пры гэтым не варта забывацца на тое, што айчынная гісторыя ведае прыклады дзейнасці парламенцкіх установаў на тэрыторыі Беларусі ўжо з XV ст., калі пачынаюць рэгулярна склікацца соймы



РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ

ВКЛ, а пасля 1569 г. соймы Рэчы Паспалітай. Чатыры сотні гадоў палітычнай гісторыі Беларусі непарыўна звязаныя з дзейнасцю соймаў, апошні з якіх адбыўся ў Гародні ў 1793 г.

Аналіз структуры і функцыянавання сучасных парламенцкіх структураў набывае якасна новы ўзровень, калі яго падмацоўваць прыкладамі з мінулага, а больш цікавы гістарычны ўзор, чым сойм Рэчы Паспалітай, знайсці немагчыма.

Не менш каштоўных назіранняў можа даць паліталагічны разбор дзейнасці судовай сістэмы ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай (*кампетэнцыя мясцовых судоў, Галоўнага Трыбунала ВКЛ, Соймавага суда*) альбо характарыстыка выканаўчай ўлады (*кампетэнцыя так званых міністраў і іх адносіны да манарха*).

Курс гісторыі і паліталогіі ў вышэйшай школе неабходна максімальна інтэграваць. Гэта дазваліць актуалізаваць у студэнтаў веды па гісторыі і рэалізаваць іх на занятках па паліталогіі.

ЛІТАРАТУРА

1. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т.1. . Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст.– Мн.: “Экаперспектыва”, 2000.
2. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т.2. Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага.– Мн.: Экоперспектива, 2008.
3. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т.3. Беларусь у часы Рэчы Паспалитай (XVII-XVIII).– Мн.: Экаперспектыва, 2004.

УДК 378.147.091: 811.161.1(476.6)

## ОНОМАСТИКА В ПРОЦЕСЕ ПРЕПОДАВАНИЯ РУССКОГО ЯЗЫКА ДЛЯ ИНОСТРАННЫХ СТУДЕНТОВ

**Голубович О.П.**
УО “Гродненский государственный аграрный университет”
г. Гродно, Республика Беларусь

В последние годы в высших учебных заведения Республики Беларусь значительно увеличилось число иностранных студентов, а также иностранных слушателей подготовительных отделений. В подавляющем большинстве это граждане из тех стран, где русский язык или вовсе не преподаётся в школах, или уровень его преподавания не совсем удовлетворительный для того, чтобы успешно обучаться в учебных заведениях Беларуси. Иностранные студенты испытывают в связи с этим значительные трудности, в некоторых случаях даже вынуждены отказываться от попытки начать обучение или продолжать его. Именно по этой причине следует обратить внимание на процесс и особенно методику преподавания русского языка, который открывает иностранцам путь к знаниям. Затронуть всю ситуацию в комплексе в данной статье не представляется возможным, поэтому предлагаем рассмотреть основные проблемы сквозь призму такого направления русского языкознания как ономастика, наука изучающая имена собственные.

Обучение иностранных студентов и слушателей русскому языку традиционно ведётся по двум направлениям:

- общелингвистическая подготовка;
- обучение профессиональной лексике

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ